ЕЎРАПЕЙСКІ МАРШ «ЗА БЯЗ'ЯДЗЕРНЫ СВЕТ»–1995 г. ПА БЕЛАРУСІ

Брусель - Парыж - Лондан - Франкфурт - Прага - Вена - Кіеў - Чарнобыль - Мінск - Масква
12 студзеня - 12 кастрычніка 1995 года

У 1995 годзе арганізацыя "За Маці Зямлю" праводзіць грандыёзны Марш, які праходзіць праз:

-пяць ядзерных дзяржаў Еўропы;

-штаб-кватэру МАГАТЭ ў Вене;

-шматлікія ваенныя і цывільныя ядзерныя аб'екты;

-Чарнобыль, месца найвялікшай катастрофы, што адбылася па віне чалавека.

"За Маці Зямлю" - гэта незалежная, некамерцыйная арганізацыя, на рахунку якой шматлікія акцыі ў абарону правоў чалавека, за разбраенне і ахову навакольнага асяроддзя.

У сваёй дзейнасці яна прытрымліваецца прынцыпаў дэмакратычнага, супольнага прыняцця рашэнняў, адмовы ад гвалтоўнага вырашэння канфліктаў.

Арганізацыя заснавана ў 1991 годзе. У 1992 годзе ёю праведзены Марш праз Амерыку працягласцю 5500 км, удзельнікі якога пехатой адолелі адлегласць ад Нью-Йорка да палігона ў Нявадзе, выказаўшы свой пратэст супраць ядзерных выпрабаванняў і парушэння правоў карэннага насельніцтва.

Еўра-Марш "За бяз'ядзерны свет" - 1995 павінен прыцягнуць увагу грамадскасці да сацыяльных, экалагічных і эканамічных наступстваў атамнага веку і прапанаваць канкрэтныя альтэрнатывы.

Марш пачаўся у Бруселі 12 студзеня 1995 года, прайшоў праз Францыю, Англію, Нідэрланды, Германію, Чэхію, Аўстрыю, Славакію; далейшы яго кірунак - Украіна, Беларусь, Расія. Закончыцца ён 12 кастрычніка 1995 года у Маскве.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ МАРШУ

- Неадкладна спыніць усе ядзерные выпрабаванні.
- Распачаць фінансаванне праграмы па ахове здароўя і забеспячэнню жыллём тых, хто пацярпеў у мінулым ад ядзерных выпрабаванняў.
- Спыніць здабычу урану, фінансаваць мерапрыемствы па ліквідацыі вынікаў яго уздзеяння на навакольнае асяроддзе.
- Адмовіцца ад вытворчасці ядзернай зброі, яе распаусюджання, знішчыць яе запасы.
- Арганізаваць фонд даследаванняў і практычных распрацовак у галіне выкарыстання ядзернага паліва без шкоды прыродзе і навакольнаму асяроддзю.
- Вывесці з эксплуатацыі ўсе ядзерныя рэактары тыпу Чарнобыль-

скага.

- Пакласці канец праніканню заходняга ядзернага лобі на Усход і спыніць да 2000 года усе іншыя ядзерныя электрастанцыі.

- Субсідзіраваць пошукі альтэрнатыўных крыніц энергіі, падтрымліваючы адначасова праграмы па энергазахаванню і канверсіі.

- Неадкладна спыніць вытворчасць усіх дадатковых ядзерных адходаў (згодна з планам адключэння) і рэгенерацыю ядзернага паліва.

- Ажыццяўляць экспертызу праблемы адходаў, фінансаванне пошуку каротка- і доўгатэрміновых праграм яе вырашэння. У пераходны перыяд захоўваць адходы ў надземных аднаўляемых сховішчах побач з існуючымі ядзернымі аб'ектамі.

- Спыніць адміністрацыйныя тэхналагічныя функцыі МАГАТЭ. Перагледзець яго устаў.

- Выкарыстоўваць МАГАТЭ толькі ў якасці арганізацыі па кантролю за ядзернай энергетыкай і стварыць новае міжнароднае энергетычнае агенцтва пад эгідай ААН для даследаванняў і падтрымкі ініцыятыў у галіне ўзнаўляемай энергіі.

Мы імкнемся да таго, каб як мага больш людзей падтрымала нашы патрабаванні, усвядоміла іх важнасць. Наша задача - не толькі прайсці па вуліцах гарадоў, але пабываць таксама на ядзерных палігонах, ва ўрадавых кабінетах і нават у турэмных камерах, калі спатрэбіцца.

Запрашаем вас далучыцца да нашага Маршу ! Ен з'яуляецца часткай міжнароднай антыядзернай кампаніі.

Мы верым, што такія пешыя маршы - эфектыуны сродак яднання людзей у наш час, калі пад пагрозай знішчэння знаходзіцца ўсё жывое.



9 жніўня 1995 года міжнародны Марш «За бяз'ядзерны свет» прыйдзе на зямлю шматпакутнай Беларусі.

Яго ўдзельнікі — прадстаўнікі розных кантынентаў (Амерыкі, Еўропы, Азіі), людзі розных узростаў, палітычных перакананняў і веравызнанняў. Усе яны аб'яднаны агульным імкненнем — абараніць свет ад атамнай і хімічнай навалы. Неабыякавыя да лёсу нашай маці Зямлі, да будучыні сваіх нашчадкаў, яны адправіліся ў паход, каб прадухіліць пагрозу знішчэння ўсяго жывога на планеце — гэта пагроза можа стаць рэальнасцю, калі будзе працягвацца бяздумная, а часам і злачынная, дзейнасць чалавека ў адносінах да навакольнага асяроддзя.

Дзевяць гадоў мінула з таго жудаснага дня, калі выбух на Чарнобыльскай АЭС паклаў пачатак новаму адліку часу ў гісторыі не толькі атамнай энергетыкі, але і чалавечай цывілізацыі. Наступствы гэтай катастрофы так ці інакш адбіліся на лесе краін і народаў і яшчэ шмат гадоў будуць уплываць на жыццё наступных пакаленняў.

Агульнавядома, што галоўны удар Чарнобыля прыняла на сябе Беларусь. Каму як не нам, жыхарам Беларусі, далучыцца да міжнароднага руху, высакародная мэта якога — барацьба за бяз'ядзерны свет, за выжыванне чалавецтва.

Арганізатары Маршу з беларускага боку лічаць неабходным скарыстаць гэту акцыю, каб узняць на належны ўзровень вырашэнне праблем нашай краіны. Побач з галоўнымі лозунгамі Маршу — «За бяз'ядзерны свет», «За правы чалавека» — беларусы павінны прапанаваць свае лозунгі, ставіць свае праблемы.

ПЕРШАЕ. Адна з галоўных — праблема агульнай экалогіі Беларусі, якая з'яўляецца фактычна краінай вялікай хіміі, дзе хімічныя камбінаты, прамысловыя прадпрыемствы будаваліся, у асноўным, без уліку мясцовых геаграфічных умоў, а ў гаспадарках часта бескантрольна выкарыстоўваецца няякасная прадукцыя сельгасхіміі.

нягледзячы на тое, што ў 1990 годзе нашым парламентам уся Беларусь была прызнана зонай экалагічнага бедства, да гэтага часу мы не маем АГУЛЬНАНАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПРАГРАМЫ АЗДАРАЎЛЕННЯ ПРЫРОДЫ, ЧАЛАВЕКА, ГРАМАДСТВА, у адпаведнасці з якой павінны вырашацца праблемы эканомікі, экалогіі, адукацыі, сацыяльна-псіхалагічнай і медыцынскай рэабіліцыі насельніцтва, навукі і культуры. Зразумела, што такая праграма будзе прадугледжваць усебаковае развіццё грамадства і чалавека з улікам нашай рэчаіснасці.

ДРУГАЯ ПРАБЛЕМА датычыцца непасрэдна наступстваў Чарнобыля. Недаравальна мала робіцца ў нашым грамадстве дзеля прафілактыкі захворванняў, аховы здароўя дзяцей і дарослых. Мы плануем правесці сустрэчы спецыялістаў, вучоных, абмеркаваць на іх сітуацыю і прапанаваць прадстаўнікам улады шляхі выйсця з яе.

ТРЭЦЯЕ. Неабходна прыцягнуць увагу грамадскасці да праблем альтэрнатыўнай энергетыкі. Вядома, што многія нашы чыноўнікі ад навукі, вобразна кажучы, «заражаны вірусам самагубства», і сёння на дзяржаўным узроўні ўжо вырашаецца пытанне будаўніцтва на нашай хворай беларускай зямлі атамнай станцыі. Няўжо мала гора прынес нам Чарнобыль? Мы не можам дазволіць, каб беларускі народ зноў стаў заложнікам гэтага сучаснага монстра — АЭС.

ЧАЦВЁРТАЯ ПРАБЛЕМА — гэта праблема «атамных салдат». Сорак гадоў таму звыш 40 тысяч беларускіх салдат былі адпраўлены для ўдзелу ў Тоцкіх ваенных вучэннях з прымяненнем атамнай зброі. Потым былі другія вучэнні, аварыі на атамных падлодках, Сяміпалацінск, Чалябінск, Новая Зямля...

Большасць з удзельнікаў гэтых падзей ужо пакінулі нас назаўсёды — памерлі ў пакутах. Тыя ж, што засталіся ў жывых,— цяжка хворыя, забытыя сваей дзяржавай людзі. Мы перакананы, што яны заслугоўваюць самай вялікай увагі і клопату з боку дзяржавы і грамадства, што нельга пакідаць іх сам на сам з іх болем.

Усе названыя праблемы патрабуюць неадкладнага вырашэння. Кожны сапраўдны грамадзянін сваёй Бацькаўшчыны павінен не заставацца ў баку, а прыняць актыўны ўдзел у мерапрыемствах Маршу. Іх будзе шмат. Гэта мітынгі, дыскусіі; «круглыя сталы» у Гомелі і Мінску, што збяруць спецыялістаў па вырашэнню Чарнобыльскіх праблем; сустрэчы вучоных з жыхарамі памёлка «Дружны», якія перасяленыя туды ў 1986 годзе з Прыпяці (будаваўся ж гэты пасёлак для супрацоўнікаў Мінскай атамнай станцыі). Запланавана таксама пасадка «Алеі міру», работа ў бальніцах з хворымі дзецьмі.

Есць і багатая культурная праграма, якая дасць магчымасць нашым гасцям пазнаёміцца бліжэй з гісторыяй, культурай, традыцыямі беларускага народа — народа старажытнага і цывілізаванага.

Свой шлях па Беларусі Марш «За бяз'ядзерны свет» закончыць 13 верасня на мяжы са Смаленшчынай.

Тамара БЕЛАОКАЯ, старшыня Беларускага камітэта «Дзеці Чарнобыля».



ГРАФИК ДВИЖЕНИЯ ЕВРОПЕЙСКОГО МАРША "ЗА БЕЗЪЯДЕРНЫЙ МИР"

ПО БЕЛАРУСИ

Дата	Место расположения лагеря	Дневной переход	Примечание
	Гомельская область Gomel Region		
АВГУСТ August			
9 ср. Wed.	Новые Ярыловичи Novye Yerylovichi	27 км	Встреча на границе
	Терюха Teryukha	20 км	
10 чт. Thu.	Гомель Gomel		
11 пт. Fri.	Гомель Gomel	25 км	
12 сб. Sat.	Боршевка Borshchevka	28 км	

Дата	Место расположения лагеря	Дневной переход	Примечание
13 вс. Sun.	Речица Rechitsa	25 км	
14 пн. Mon.	Заречье Zarechye	26 км	
15 вт. Tue.	Боровики Borovlki	26 км	
16 ср. Wed.	Светлогорск Svetlogorsk	25 км	
17 чт. Thu.	Паричи Parichi	32 км	
	Могилевская область Mogilyov Region		
18 пт. Fri.	Стаевка Staevka		
19 сб. Sat.	Бобруйск Bobruysk	25 км	
20 вс. Sun.	Бобруйск Bobruysk		
21 пн. Mon.	Ясень Yasen	20 км	
22 вт. Tue.	Осиповичи Osipovichi	25 км	
23 ср. Wed.	Осиповичи Osipovichi	25 км	
24 чт. Tue.	Лапичи Lapichy	25 км	
	Минская область Minsk Region		
25 пт. Fri.	Пуховичи Pukhovichi	22 км	
26 сб. Sat.	Дружный Drushny	30 км	
27 вс. Sun.	Дружный Drushny		
28 пн. Mon.	Минск Minsk		Выезд на Минск эл. поездом
29 вт. Tue.	Минск Minsk		

Дата	Место расположения лагеря	Дневной переход	Примечание
30 ср. Wed.	Дружный Drushny		Возврат обратно
31 чт. Thu.	Смиловичи Smilovichi	22 км	
СЕНТЯБРЬ September			
1 пт. Fri.	Червень Cherven	26 км	
2 сб. Sat.	Хутор Khutor	20 км	
3 вс. Sun.	Березино Beresino	22 км	
	Могилевская область Mogilyov Region		
4 пн. Mon.	Корытница Korytnitsa	30 км	
5 вт. Tue.	Белыничи Belynichy	22 км	
6 ср. Wed.	Вишов Wishov	18 км	
7 чт. Thu.	Могилев Mogilyov	25 км	
8 пт. Fri.	Могилев Mogilyov		
9 сб. Sat.	Шклов Shklov	30 км	
10 вс. Sun.	Городище Gorodishche	25 км	
11 пн. Mon.	Овсянка Ovsyanka	19 км	
12 вт. Tue.	Горки Gorki		
12 вт. Tue.	Ленино Lenino	18 км	
13 ср. Wed.			Проводы

ОРГАНИЗАЦИЯ СВЯЗИ С РУКОВОДИТЕЛЯМИ БЕЛОРУССКОГО И ОБЛАСТНЫХ ОРГКОМИТЕТОВ ПО ПРОВЕДЕНИЮ ЕВРОПЕЙСКОГО МАРША "ЗА БЕЗЪЯДЕРНЫЙ МИР"

N	Фамилия, имя, отчество	Должность	Город	Конт. телефоны
1.	Белоокая Тамара Васильевна	Председатель Бел. оргкомитета	г. Минск	8(0172)51-43-11 52-11-17
2.	Куприянов Игорь Семенович	Зам. председателя Бел. оргкомитета	г. Минск	8(0172)29-68-33 дом. 60-26-91
3.	Грибова Анна Исааковна	Секретарь Бел. оргкомитета	г. Минск	8(0172)51-43-11 52-11-17 дом. 33-90-86
4.	Борина Татьяна Павловна	Координатор Бел. оргкомитета	г. Минск	8(0172)51-43-11 52-11-17 дом. 64-00-18
5.	Мандрик Светлана Владимировна	Координатор Бел. оргкомитета	г. Минск	дом. 63-51-44
6.	Астахов Анатолий Сергеевич	Координатор по г. Минску	г. Минск	8(0172)20-60-64

ГОМЕЛЬСКАЯ ОБЛАСТЬ

1.	Жуковец Василий Емельянович	Председатель обл. оргкомитета	г. Гомель	8(0232)55-73-88
2.	Стельмах Николай Николаевич	Зам. председателя обл. оргкомитета	г. Гомель	53-69-13 53-72-77 53-71-82
3.	Лукашев Павел Васильевич	Зам. председателя обл. оргкомитета	г. Гомель	52-47-32
4.	Рычков Александр Евгеньевич	Представитель от Бел. оргкомитета в Гомельской обл.	г. Гомель	57-16-23 дом. 55-97-89
5.	Кошевенко Ольга Николаевна	Секретарь обл. оргкомитета	г. Гомель	53-38-41

Гомельский областной оргкомитет Бел. участка МЭМ: 246050, Гомель, пр. Ленина, 2. Гомельский облисполком, комн. 532, т. 53-51-44 с 9.00 до 17.00. В остальное время обращаться по тел. членов Оргкомитета.

МИНСКАЯ ОБЛАСТЬ

1.	Павлюкевич Сергей Сергеевич	Председатель обл. оргкомитета	г. Минск	8(0172)27-44-46 дом. 36-15-36
2.	Скалабо Николай Дмитриевич	Зам. председателя обл. оргкомитета	г. Минск	27-53-28 дом. 26-49-23
3.	Кешеня Александр Петрович	Председатель Свислочского Исполкома Пуховичского райисполкома	Пуховичи, Дружный	8(213)94-475 дом. 94-320
4.	Ершова Лариса Васильевна	Зам. председателя райисполкома	Пуховичск. Пуховичи, Дружный	8(213)50-023 дом. 52-290
5.	Калбович Марина Александровна	Председатель комитета по делам молод.	Смиловичи, Червень	8(214)53-338 д. 54-240
6.	Лысковец Геннадий Степанович	Зам. председателя Березинского райисполкома	г. Березино	8(215)553-41 дом. 54-542

МОГИЛЕВСКАЯ ОБЛАСТЬ

1.	Корсак Владимир Леонидович	Председатель оргкомитета	г. Могилев	8(02222)44-84-04
2.	Соколов Николай Васильевич	Координатор оргкомитета	г. Могилев	25-02-68 22-06-00
3.	Тоестев Владимир Константинович	Зам. председателя оргкомитета	г. Могилев	22-24-82
4.	Белькевич Борис Иванович	Координатор	г. Бобруйск	8(02251)7-25-14 7-20-41
5.	Гляк Людмила Анатольевна	Координатор	г. Шклов	8(02239)21-063 21-162
6.	Жук Иван Михайлович	Координатор	Городище	8(02233)22-386

ЗВАРОТ

ДА ЖЫХАРОЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

На працягу дзесяці месяцаў удзельнікі Міжнароднага маршу "За бяз'ядзерны свет" пройдуць 5500км.

Мэта Маршу - прыцягнуць увагу сусветнай грамадскасці да праблем здароўя і жыцця людзей, да сацыяльных, экалагічных, эканамічных наступстваў выкарыстання атама ў жыцці чалавецтва.

Удзельнікі Маршу прапануюць канкрэтныя альтэрнатыўныя крыніцы энергіі, а таксама праграмы энергазахавання.

Мэта Маршу - вольны ад атама свет - будзе дасягнута дзякуючы ўдзелу ў ім шырокай грамадскасці, навукоўцаў, правядзенню шматлікіх мірных акцый на вуліцах гарадоў, тэатралізаваных відовішчаў, прыняцці зваротаў да ўрадаў, асвятленню ўсіх падзей сродкамі масавай інфармацыі - газетамі, часопісамі, тэлебачаннем, радыё.

Да ўдзелу ў Маршы запрашаюцца ўсе жыхары Беларусі, якія неабыякава ставяцца да здароўя і жыцця сваіх дзяцей і ўнукаў, да будучыні нашай Зямлі. Вы можаце прайсці з намі ўвесь шлях або частку яго.Гэта дасць вам унікальную магчымасць кантактаў з аднадумцамі - прадстаўнікамі самых розных краін свету, а таксама суайчыннікамі з-за мяжы.

Мы праходзім у сярэднім 25 км у дзень, адзін дзень на тыдні адпачываем. Удзельнікі забяспечваюцца вегетарыянскай ежай, рэчамі першай неабходнасці.

З задавальненнем улічым усе вашы прапановы па правядзенню Маршу на Беларусі.

Заклікаем тых, хто не прыме непасрэднага ўдзелу ў Маршы, дачыніцца да гэтай падзеі, ахвяраваўшы сродкі на яе правядзенне, што паспрыяе поспеху выдатнай міжнароднай акцыі. Нам патрэбна спонсарская падтрымка.

АРГКАМІТЭТ.

БЕЛАРУСКІ КАМІТЭТ "ДЗЕЦІ ЧАРНОБЫЛЯ"

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная Звезда».
Зак. 1200. Тыр. 10 000 экз.